# СКАНВОРД

Цыркавы артыст | Астатак недагарэлай свечкі | Выпукласць на спіне | Жалезныя цяжы ў возе | Дзічына да ананаса | Вельмі тоўстае дрэва | Ён іграе на трубе | Марская рыба | Збудаванне для выдалення лёду | Пасма валасоў на лбе хлопца | Пакет для малака | Вобад са спіцамі | Бег пад крыкі "Ура!" | Снежныя хадулі | Расліна сям. гарбузовых | Опера Ж.Маснэ | Будынак для малацьбы збожжа | Частка малекулы | Чалавек, які крыўляецца | Імі падбіраюць сена | Званне духоўнай асобы | Лічбавая ацэнка поспехаў | Змесціва кішэчніка | Насавая частка палубы | Эстрадны артыст | Тэатральнае адзенне | Алейная культура | Балотная трава | Чырвоны каштоўны камень



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**По гарызанталі:** Акрабат. Горб. Акула. Чуб. Лыжы. Атака. Кабачок. Атам. Вілы. Сан. Касцюм. Бак. Асака. Спявак. Лал. **Па вертыкалі:** Атосы. Рабчык. Баабаб. Трубач. Агарак. Ледаспуск. Тара. Кола. Таіс. Млын. Ламака. Соя. Мак. Бал. Кал.

Склаў
**Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.22 | 19.54 | 13.32 |
| Віцебск — | 6.09 | 19.46 | 13.37 |
| Магілёў — | 6.12 | 19.45 | 13.33 |
| Гомель — | 6.11 | 19.39 | 13.28 |
| Гродна — | 6.37 | 20.09 | 13.32 |
| Брэст — | 6.40 | 20.07 | 13.27 |

**Месяц**

***Поўня 2 верасня.***
***Месяц у сузор'і Авена.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Абрама, Агапія, Аляксандра, Паўла, Фадзея.*
***К.*** *Ізабелы, Рыгора, Шымана, Яўхіма.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

**3 ВЕРАСНЯ**

У краіне

**1915** год — з Баранавіч у Магілёў перамешчаная стаўка Галоўнакамандуючага ўзброенымі сіламі Расіі цара Мікалая II (размяшчалася там да 1918 года).

У гэты ж дзень нарадзіўся Барыс Іпалітавіч Райскі, беларускі дырыжор, заслужаны артыст Беларусі. З 1957 года — галоўны дырыжор аркестра Мінскага цырка. У 1961—1988 гадах — галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік канцэртна-эстраднага аркестра Беларускага тэлебачання і радыё. Аўтар аранжыровак для эстраднага і сімфанічнага аркестраў.



**1930** год — нарадзіўся Юрый Фёдаравіч Патапаў, беларускі архітэктар, заслужаны архітэктар Беларусі. Асноўныя работы (усё ў суаўтарстве): добраўпарадкаванне прывакзальнай плошчы, 16-павярховая гасцініца па вуліцы Савецкіх пагранічнікаў у Гродне, Мінскі лядовы палац спорту, мост цераз Заходнюю Дзвіну і іншыя.

У гэты ж дзень нарадзіўся Павел Іванавіч Ткачоў, беларускі пісьменнік, літаратуразнавец, доктар філалагічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі. Пісаў пераважна для дзяцей. Аўтар кніг «Самае галоўнае», «Вішнёвая квецень» і іншых.

У свеце

**1905** год — нарадзіўся Карл Дэвід Андэрсан, амерыканскі фізік, які адкрыў у 1932-м пазітрон, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы.

**1965** год — нарадзілася Марына Вячаславаўна Зудзіна, расійская актрыса тэатра і кіно, народная артыстка Расіі. Здымалася ў фільмах «Валянцін і Валянціна», «Па галоўнай вуліцы з аркестрам», «Трыбунал» і іншых.



У гэты ж дзень нарадзіўся Чарлі Шын (Карлас Ірвін Эстэвез), амерыканскі акцёр, сцэнарыст, прадзюсар. Здымаўся ў фільмах «Узвод», «Вышэйшая ліга», «Гарачыя галовы» і іншых.

Так гаварыў...

**ФРЭНСІС БЭКАН:**
*«Магчымасць украсці стварае злодзея».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Лена з Юрам жылі шчасліва... Пакуль не сталі высвятляць, хто каго ашчаслівіў.**

— Я зразумеў, што мне трэба нешта мяняць у жыцці!
— І што цяпер? Ты сядзеш на тэлевізар і станеш глядзець на канапу?

**Пра мой узрост магу сказаць:**
**— Прынца на белым кані ўжо не чакаю, але да цокату капытоў яшчэ прыслухоўваюся...**

Пеця і Ніна жывуць у поўнай гармоніі: тыя ж перавагі, тыя ж ідэі, тыя ж жаданні. Толькі ў Пеці сышло пяць гадоў, каб да гэтага прыстасавацца.

**Важнае для сябе і свайй жонкі адкрыццё зрабіў грамадзянін Васільеў.**
**Ён заўважыў, што праца — жаночага роду, а адпачынак — мужчынскага.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 317 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым знакам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы несуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2837.
Нумар падпісаны ў 19.30 2 верасня 2020 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12